фашысты катавалі адважную разведчыцу. Таня змагла перадаць на волю 2 запіскі. У адной з іх яна папярэдзіла таварышаў аб магчымых арыштах. 2.8.1942 г. Таню па-зверску закатавалі. Званне Героя Савецкага Саюза Т. С. Марыненка прысвоена 8.5.1965 г. Яе імя прысвоена Зялёнкаўскай сярэдняй школе, у Полацку пастаўлены помнік, на будынку педвучылішча, дзе яна вучылася, установлена мемарыяльная дошка.

У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Літ.: Полоцк: Исторический очерк.— Мн., 1962; Навечно в сердце народном.— 3 изд.— Мн., 1984. *М. В. Кірэйшын.*

1956. МЕСЦА ФАРМІРАВАННЯ І ДЗЕЙНАСЦІ ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА Ў АЙЧЫННУЮ ВАЙНУ 1812 г. (гіст.). У Айчынную вайну 1812 г. ўсё дарослае насельніцтва в. Жарцы аб'ядналася ў партызанскі атрад на чале з мясцовым селянінам Максімам Маркавым. У верасні 1812 г. партызаны напалі на батальён пяхоты і эскадрон кавалерыі праціўніка, нанеслі яму значныя страты і прымусілі адступіць. У кастрычніку атрад прымаў удзел у 2 бітвах за Полацк. Генерал Е. І. Уластаў у рапарце камандзіру корпуса П. Х. Вітгенштэйну так ацаніў подзвіг сялян в. Жарцы: «Абавязкам лічу прасіць ваша сіяцельства, каб вядомы быў публіцы гэты здзіўляючы ўчынак тых мужыкоў, які даказвае, што вельмі добрая іх любоў і адданасць Айчыне і да ворагаў яе непрымірымая варожасць прымусілі іх узброіцца па ўласнай сваёй волі і, забыўшыся на ўсе жахі вайны, ахвяраваць жыццём сваім, выключна каб знішчыць ворагаў Айчыны». За праяўленую мужнасць у баях супраць ворага 22 партызаны атрада былі ўзнагароджаны крыжамі.

Літ.: Корнейчик Е. И. Белорусский народ в Отечественной войне 1812 г.— Мн., 1962. *Э. М. Савіцкі.*



1955. *Помнік на магіле Т. С. Марыненка.*

в. Заазер'е, Гомельскі сельсавет

1957. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 3 км на паўднёвы захад ад вёскі. Пахаваны 127 мірных жыхароў в. Заазер'е і навакольных вёсак, якіх 29.5.1944 г. загубілі нямецка-фашысцкія акупанты. У 1964 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1958. МЕСЦА РАЗМЯШЧЭННЯ ШТАБА ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА «КІМ» (гіст.). У 1943—44 гг. у вёсцы размяшчаўся штаб маладзёжнага партызанскага атрада «КІМ» брыгады імя К. Я. Варашылава. Створаны ў маі 1943 г. з часткі асабовага складу, вылучанай з партызанскага атрада «Мсцівец». Камандзіры І. І. Яльцоў, К. В. Суворaў, камісар А. Ф. Вярбіцкі.

У 1955 г. на доме, дзе размяшчаўся штаб атрада, устаноўлена мемарыяльная дошка.

в. Забор'е (не існуе), Палатоўскі сельсавет

1959. МЕСЦА СПАЛЕНАЙ ВЁСКІ (гіст.). Вёска Забор'е знаходзілася за 10 км на паўночны ўсход ад в. Домнікі Гаранскага сельсавета. У чэрвені 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі загубілі 138 яе жыхароў і спалілі вёску. Пасля вайны не адрадзілася. У 1968 г. на месцы былой вёскі пастаўлены абеліск.


в. Загацце, Бабыніцкі сельсавет

1960. ГАРАДЗІШЧА, СЕЛІШЧА (археал.).

1960а. Гарадзішча. Каля вёскі, на беразе воз. Нявіда, на гары вышынёй да 20 м, якая з паўночнага і заходняга бакоў абмываецца ручаём. Пляцоўка авальная памерам 55×30 м, уваход з усходняга боку, дзе вышыня пагорка 7—8 м. Тут на пляцоўцы прасочаны рэшткі дугападобнага вала вышынёй да 2 м. Абследаваў у 1955 г. Л. В. Аляксееў, даследаваў у 1973 г. Г. В. Штыхаў. Культурны пласт 0,8 м. Знойдзена ляпная кераміка, косці жывёлы, абломак жалезнага сярпа. Адносіцца да ранняга жалезнага веку.

1960б. Селішча. Побач з вёскай, з паўднёва-ўсходняга боку ад гарадзішча. Абследавалі ў 1955 г. Л. В. Аляксееў, у 1973 г. Г. В. Штыхаў. Знойдзены абломак ляпной пасудзіны, упругожанай расчосамі, і шмат ганчарнай керамікі.

Матэрыялы абследавання захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.



1963. *Гарадзішча.*

Літ.: Алексеев Л. В. Археологические памятники эпохи железа в среднем течении Западной Двины.— У кн.: Вопросы этнической истории народов Прибалтики. М., 1959.— (Труды Прибалтийской объединенной комплексной экспедиции; [т.] 1). *Г. В. Штыхаў.*

в. Загорцы (не існуе), Шпакоўшчынскі сельсавет

1961. МЕСЦА СПАЛЕНАЙ ВЁСКІ (гіст.). Вёска Загорцы знаходзілася за 2 км на паўднёвы захад ад в. Шпакоўшчына. У жніўні 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі загубілі 24 жыхароў і спалілі вёску (13 двароў). Пасля вайны не адрадзілася. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе Хатынь.

в. Залессе, Гаранскі сельсавет

1962. МАГІЛА СЯРОВА Сяргея Канстанцінавіча (гіст.). У парку. Гвардыі капітан Чырвонай Арміі С. К. Сяроў загінуў у баі ў 1944 г. У 1956 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Замошша 1-е, Бабыніцкі сельсавет

1963. ГАРАДЗІШЧА (археал.). За 0,3 км на паўднёвы захад ад вёскі, на ўзгорку вышынёй каля 13 м, сярод забалочанай мясцовасці. Пляцоўка авальнай формы памерам 55×38 м, валы і равы не прасочваюцца. Вядома з канца 19 ст. Абследавалі ў 1949 г. А. Р. Мітрафанаў, у 1972 г. Г. В. Штыхаў, даследаваў (на плошчы 500 м²) у 1977—80 гг. В. І. Шадыра. Культурны пласт 0,4 м на краі пляцоўкі і каля 2 м у цэнтры, мае 2 гарызонты. У ніжнім гарызонце выяўлены каменныя клінападобныя (каля 100 штук) і прамавугольныя сякеры, камяні ад зерняцёрак, мялы і цёрачнікі, касцяныя вастрыі, праколкі, долаты, наканечнікі стрэл, коп'яў і дроцікаў, касцяныя шпількі ад галаўнога ўбору. У верхнім гарызонце знойдзены жалезныя сякеры, шылы, фрагменты вузкалязовых сякер, сярпы з прамавугольнай спінкай, характэрныя толькі для гарадзішчаў Беларускага Падзвіння. Выяўлены рэшткі круглых у плане агнішчаў, сабраны абломкі гладкасценнага слоікавага посуду з адтулінамі па венчыку. Слабапрафіляваныя гаршкі арнаментаваны злучанымі пракрэсленымі лініямі ці скразнымі адтулінамі. Знойдзены